ПЯЦЬ МІЛЬЕНАЎ РУБЛЕЎ СТРАТ—НА ТРАКТАРЫ, ДОМНЫ, МАШЫНЫ

Буйная перашкода на шляху соцбудаўніцтва—бездарожжа—павінна быць і будзе ліквідавана

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

13 лістапада 1931 г. № 269 (1531)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Ударна рэалізуем пастанову ЦК КП(б)Б

Мы атрымалі перамогу у вырашэньні праблемы тэхкультур за вясновую пасеўную і асеньнюю ўборачную кампаніі. Гэтая перамога павінна быць замацавана пасьпяховым скончэньнем апрацоўкі прадукцыі лёну і канапель і поўным выкананьнем плянаў загатовак у самы кароткі тэрмін.

Пасьпяховае выкананьне гэтай задачы неадлучна зьвязана з асноўной задачай: арганізацыйна-гаспадарчым замацаваньнем калгасаў і далейшым бурным ростам соцыялістычнай гаспадаркі тэхкультур.

Між тым апрацоўка лёну і канапель і асабліва здача іх яўна не задавальняючы. Мы маем ганебнае становішча, калі плян загатоўкі лёну выканан усяго каля 5 проц. Сёньнешні матэр'ял Сіропінскага раёну гаворыць, што комсамольская арганізацыя раёну опортуністычна бязьдзейнічае у загатоўках лёну. Тут ня здолелі мобілізаваць масы моладзі колгасьнікаў, беднякоў-серадлякоў аднаасобнікаў на выкананьне плянаў апрацоўкі і загатоўкі лёну.

Такое становішча мы маем і ў другіх раёнах. Гэтыя факты гавораць аб тым, што комсамольская арганізацыя ў цэлым радзе раёнаў не мобілізавалася на выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б аб першачарговай здачы лёну і канапель.

Рашучы пералом павінен быць зроблен неадкладна.

ЦК КП(б)Б абвясьціў месячнік апрацоўкі і здачы лёну. Задача у тым, каб комсамольскія арганізацыі неадкладна ліквідавалі недахопы і перабудавалі сваю работу на штодзённае опэрацыйнае кіраўніцтва справам апрацоўкі і загатоўкі лёну і канапель. Кожная колгасная ячэйка павінна мець выразны плян работы па сушцы, мяцьні і трапаньні. Конвэер перапрацоўкі-здачы продукцыі дзяржаве павінен стаць сыстэмай работы.

Увядзеньне зьдзельна-прэміяльнай сыстэмы, разгортваньне соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечыць хутчэйшае выкананьне гэтай задачы.

Якасьць продукцыі ўсё яшчэ не здавальняе. Комсамольскія ячэйкі павінны зьвярнуць асабл вую увагу на якасьць апрацоўкі лёну і канапель, што зьяўляецца часткай барацьбы за тэхкультуры.

Неабходна зараз праверыць клясавую баяздольнасьць загатоўчага апарату, выкрываючы і вымятаючы клясава-чужыя элементы, высоўваючы у нарыхт. апарат лепшых колгасьнікаў і комсамольцаў.

Будаўніцтва ільнозаводаў ідзе яшчэ усё марудна. Задача будаўнічага комсамолу—усямерна фарсаваць будаўніцтва ільнозаводаў.

Кулацка-заможныя гаспадаркі, праяўляючы клясавую барацьбу су проць бальшавіцкіх тэмпаў перапрацоўкі ільну, стараюцца затармазіць, сарваць загатоўкі, ня выконваюць цьвёрдыя заданьні і вядуць шалёную агітацыю сярод бядн. і серад. аднаасобнікаў і колгасьнікаў

Цьвёрды націск на кулацка-заможныя гаспадаркі, шырокае разгортваньне масавай растлумачальнай работы вакол загатовак сярод колгасьнікаў, беднякоў і серадлякоў аднаасобнікаў—важнейшыя ўмовы пасьпяховай перапрацоўкі і загатоўкі лёну і канапель.

Спаборніцтва комсамольскіх газэт—спаборніцтва ўсяго ленінскага комсамолу

Ўсебеларускі комсамольскі суботнік па барацьбе з бездарожжам падыходзіць к канцу. Новыя дзесяткі і сотні кілёмэтраў пракладзеных і адрамантаваных дарог, новыя стужкі пасаджаных дрэў, узьнятая крывая выкананьня плянаў дарожнага будаўніцтва—сьведкі барацьбы комсамолу з бездарожжам.

Ніжэй мы зьмяшчаем дагавор, які заключаны паміж „Чырвонай Зьменай" і газэтай ленінградзкага абласнога камітэту комсамолу „Смена", на соцыялістычнае спаборніцтва ў выкананьні плянаў дарожнага будаўніцтва. У сваім выкліку „Смене" мы вызначылі рад абавязкаў, якія зьяўляюцца практычнымі задачамі ўсяго беларускага комсамолу ў яго барацьбе з бездарожжам.

Соцыялістычнае спаборніцтва з ленінградзкай комсамоліяй праз яе орган „Смена" прымушае беларускую комсамолію неадкладна разгарнуць падрыхтоўку да будучага сэзону, змагацца за поўнае выкананьне плянаў дарожнага будаўніцтва г. г., за мэханізацыю дарожных работ і падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў.

Зараз-жа прыступіць да рэалізацыі дагавору. Дамагацца, каб узятыя абавязкі былі выкананы з гонарам.

УМОВА

на правядзеньне соцыялістычнага спаборніцтва у лепшым выкананьні плянаў дарожнага будаўніцтва на 1931—32 г. паміж ЦО беларускага комсамолу „Чырвонай Зьменай" у асобе яе ўпаўнаважанага—загадчыка вытворчым сэктарам т. Л. Глезэра—з аднаго боку і газэтай ленінградзкага комсамолу „Смена" у асобе загадчыка абласнога сэктара—т. П. Бачкарова—з другога

1. Спаборніцтва двух комсамольскіх газэт выклікана задачай вялікшай гаспадарчай і палітычнай важнасьці. Бездарожжа гэта—вялікая і страшэнная перашкода на шляху соцыялістычнага будаўніцтва, гэта—5 мільёнаў руб. страт, якія церпіць штогод наша народная гаспадарка гэта—вялікая перашкода на шляху гасападарчага і культурнага росту краіны.

У гэтых умовах перад комсамолам і яго газэтамі стаяць вялікія і адказныя задачы. Комсамол павінен кінуць свае сілы, мобілізаваць усю рабочую і колгасную моладзь на ажыцьцяўленьне задачы поўнага выкананьня плянаў дарожнага будаўніцтва 1931-32 г. аховы спраўнасьці дарог і падрыхтоўкі да будучага будаўнічага сэзону.

Выходзячы з гэтага, газэты „Чырвоная Зьмена" (у дадатак да ўзятых па сябе абавязкаў у лісьце да „Смены" ад 18 кастрычніка 1931 г.) і „Смена", уключаючыся у спаборніцтва, бяруць на сябе наступныя абавязацельствы:

а) На аснове соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва мобілізаваць увагу ўсёй грамадзкасьці, і ў першую чаргу комсамол, на барацьбу за пасьпяховае заканчэньне дарожнага будаўніцтва, за ахову дарог і спраўнае ўтрыманьне іх. Усю работу праводзіць пад лёзунгам: „У раёне дзейнасьці комсамольскай ячэйкі ўсе дарогі павінны быць у поўнай спраўнасьці".

б) На ўсіх вучастках дарожнага будаўніцтва дамагчыся ліквідацыі цякучасьці рабочае сілы, ураўнілаўкі у зарплаце, абязьлічкі машын, пераводу дыстанцый і вучасткаў на гасразрахунак, эканомнага і ашчаднага скарыстаньня будаўнічых матэр'ялаў, транспорту і палепшаньня культурнага абслугоўваньня рабочых."

в) Рэдакцыі бяруць на сябе абавязацельства ня менш як у двух раёнах організаваць узорную работу па рамонту дарог і мастоў.

г) Мобілізаваць увагу комсамолу фабрык і заводаў г. Ленінграда, Менску і Віцебску на своечасовае і поўнае выкананьне заказаў для дарожнага будаўніцтва.

д) Зараз-жа пасьля падпісаньня умовы разгарнуць падрыхтоўчую работу па дарожнаму будаўніцтву 1932 году, дзеля чаго: а) давесьці тэхнічны плян дарожнага будаўніцтва да сяла і раёну, да шырокіх працоўных мас: б) узяць пад кантроль падрыхтоўку дарожных кадраў (школы Дарбудвучу, кароткатэрміновыя курсы і г. д.) дабіваючыся найбольшага ўкомплектаваньня іх комсамольскімі сіламі; в) своечасова разгарнуць работу па падрыхтоўцы каменьня, лесу і іншых будаўнічых матэр'ялаў, дабіваючыся вывазкі іх да пачатку работы.

е) Да пачатку работ забясьпечыць у складзе інжынэрна-тэхнічных сіл поўны процант комсамольцаў, але ня ніжэй 15 проц. усяго складу ІТР дарожнага будаўніцтва.

ж) Для выкананьня пунктаў умовы пры рэдакцыях стварыць штабы па дарожнаму будаўніцтву ў складзе прадстаўніка ад комсамолу і ўсіх зацікаўленых організацый. Організаваць на мясцох кантрольныя юнкораўскія пасты, выязныя рэдакцыі ў раёны, дзе вытвараюцца работы, організаваць комсамольскія суботнікі. Устанавіць паміж газэтамі рэгулярны абмен вопытам работы шляхам пасылкі матэр'ялаў, выпуску сумесных палос і г. д.

2. Тэрмінам праверкі выкананьня умовы ўстанавіць 1-е сакавіка 1932 году.

3. Умова заключана тэрмінам да 1-га кастрычніка 1932 г.

4. У склад журы абіраецца ўсесаюзны штаб па барацьбе з бездарожжам, „Комсомольская правда" і Цэнтральны савет Аўтодору.

По даручэньню рэдакцыі „Чырвонай зьмены" Л. Глезэр.

По даручэньню рэдакцыі газэты „Смена" П. Бачкароў.

6-га лістапада 1931 г.

Г. Ленінград,
рэдакцыя газэты „Смена".

Абмежаваліся дырэктывамі

Комсамольскія ячэйкі Капыльскага р. ня ўсе яшчэ ўключыліся ў штурм бездарожжа. Напрыклад: ячэйкі колгасаў „Сталінец", „Барацьбіт № 2", і колгас капыльскай бел ШКМ.

Райкому комсамолу неабходна тэрмінова даць адпаведныя паказаньні ячэйкам, якія ня ўключыліся ва ўсесаюзны суботнік барацьбы з бездарожжам. Вінаватых у зрыве суботніка прыцягнуць да адказнасьці.

Салагуб.

Адкрыты ліст інжынэрна-тэхнічным працаўнікам Дарбуду

Комсамол БССР абвясьціў паход па ліквідацыі бездарожжа.

На пастанове ЦК ЛКСМБ комсамольскія організацыі правялі ўсебеларускі суботнік барацьбы з бездарожжам. За час суботніка дасягнута шмат дадатна. У шмат якіх раёнах пляны дарожнага будаўніцтва амаль поўнасьцю выкананы. Але, побач з дадатнымі вынікамі ёсьць і недахопы.

У асноўным недахопы ў разгортваньні дарожнага будаўніцтва зводзяцца да таго, што комсамольскія організацыі і паасобныя комсамольцы ня маюць навукова-тэхнічных ведаў і звычак у дарожным будаўніцтве і ў большасьці сваёй не знаёмы з навукова-тэхнічнымі дасягненьнямі, якія мы зараз маем у галіне дарожнага будаўніцтва.

Перадаць навукова-тэхнічныя веды комсамольцам, навучыць іх скарыстоўваць навуковыя мэтоды работы—вось задача інжынэрна-тэхнічных работнікаў Дарбуду.

Інжынэры, тэхнікі і экономісты Галоўдартрансу павінны садзейнічаць організацыі кароткатэрміновых курсаў для комсамольцаў і рабочае моладзі па падрыхтоўцы кадраў дарбуду. Галоўдартранс павінен організаваць на паасобных вучастках консультацыйнае бюро, у якіх работу разгортваць павінны інжынэры і тэхнікі.

Праз друк навукова-тэхнічныя працаўнікі павінны організаваць консультацыю для маладых тэхнікаў дарбуду, даваць навуковыя указаньні па асобных галінах будаўніцтва. Інжынэры і тэхнікі дарбуду павінны бязьлітасна змагацца з старымі закасьцянелымі адносінамі да перадачы навукова-тэхнічнага вопыту комсамольцам і рабочай моладзі.

Тэрмінова неабходна організаваць мэтодычную і навукова-тэхнічную консультацыю маладых рабочых дарбуду. Інжынэрна-тэхнічны колектыў Галоўдартрансу павінен пайсьці насустрач гэтаму і даць лепшых інжынэраў і тэхнікаў, каб забясьпечыць пасьпяховую навукова-тэхнічную падрыхтоўку маладых рабочых і асабліва комсамольцаў, якія зараз бязьлітасна змагаюцца з бездарожжам.

Інжынэр Галоўдартрансу Варноўскі.

Дадзь добры гараж аўтотранспорту.

Дружна пракладаюць шляхі

Пад кіраўніцтвам Бярэзінскага РК ЛКСМБ 19-га кастрычніка быў організаваны суботнік па барацьбе з бездарожжам.

Комсамольцамі сумесна з рабочай і колгаснай моладзьдзю, рассыпана па лініі дарогі 75 куб. мэт. шчэбеню. Гэта ў першы дзень суботніка.

Надалей, комсамолія Бярэзіншчыны пастанавіла: з 23-га па 28-е кастрычн. кожны дзень аддаць штурму прарываў на дарозе.

Мартынаў.

Пляны будаўніцтва ня выкананы

Мсьціслаўскі раён, на тэрыторыі якога шмат дрэнных зусім не праезных дарог, ня выканаў плянаў рамонту і будаўніцтва.

Асноўная прычына у тым, што насельніцтва слаба ўдзельнічае у працоўнай дарпавіннасьці. Асабліва зрываюць работу колгасы некаторых с-саветаў. Падсолтаўскі, Старасельскі і інш. с-саветы ня лічаць патрэбным прыцягваць да адказнасьці зрыўшчыкаў дарожнага будаўніцтва.

Акрамя гэтага, райфінаддзел не адпускае сродкаў на рамонт дарог і будаўніцтва мастоў, хаця Мсьціслаўскі РВК і інш. організацыі добра ведаюць аб тым, што многія масты недабудаваны, многія чакаюць безадкладнага рамонту, ня кажучы ўжо аб пільнай патрэбе пабудаваць новыя масты ў некаторых с-саветах.

У выдачы зарплаты рабочым-сэзоньнікам і сталым працаўнікам дараддзелу штомесяц зрывы: запазычнасьць на 2-3 месяцы ўвайшла ў сыстэму.

Продуктамі і прамтаварамі рабочыя дарбуду забясьпечваюцца бясплянава. Сталыя працаўнікі яшчэ і па сёньня ня ўключаны ў пляны 3-за гэтага шмат рабочай сілы кінула будаўніцтва многія дзесятнікі адмовіліся ад выкананьня сваіх абавязкаў.

Партыйным і савецкім організацыям неабходна зрабіць рашучы пералом у забясьпечаньні рабочых дарбуду, прыцягнуўшы да суровай адказнасьці асоб, якія зрываюць поўнае выкананьне плянаў рамонту і будаўніцтва дарог.

ПЯТРОЎ.

Высьлізнулі асноўныя зьвеньні ў рабоце

Большасьць комсамольскіх ячэек Сіроцінскага раёну— у баку ад ільназагатовак і организацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў

Патрабуем неадкладнага абнаўленьня кіраўніцтва

Сіроцінскі раён адзін з буйнейшых ільназдатных раёнаў БССР. Здавалася-б, што комсамольская арганізацыя р'ёну павінна была сваячасова прыняць усе захады да выкананьня задачы ільназдачы дзяржаве. Аднак, гэтага не відаць. Раз большасьць комсамольскіх ячэек. Ініцыятыва пераважных ячэек колгасаў „Ленінец“, „Серп і молат,“ Сталіна ў Сіроцінскім сельсавеце і інш. „КІМ“, „Бальшавік“, „Чырвоны пуцілавец“ выступалі на сходах з правапортуністычнымі прамовамі аб перавышэньні пляну загатовак. Гэтыя выступленьні часта не атрымлівалі патрэбнага адпору.

Сакратар ячэйкі-м. Сіроціна, калі го запыталі, што зроблена з комсамольцамі, якія выступалі супроць рэальнасьці пляну загатовак, адказаў: „У яго хранічны правы опортунізм, і чаму гэта з ім ня можам зрабіць“. Райком комсамолу не мобілізаваў комсамольскіх масы, каб даць рашучы адпор гэтым правым выступленьням.

Апрацоўка ільнавалакна ў раёне праводзіцца зусім слаба. РК ЛКСМБ не мобілізаваў арганізацыю на выкананьне гэтай важнейшай палітычнай задачы.

Як вынік слабай апрацоўкі лёну, здача валакна дзяржаве праходзіць самацёкам. Пляны выканаваны ў мізэрных лічбах. На тэр'торыі раёну—2 ільнапункты: у Сіроціне і Лоўжы Сіроцінскі пункт да апошняга часу не працаваў з-за галаваццяства кансіцаву і праўленьня колгасу, якія за ўвесь час не змаглі адрамантаваць абсталяваньне, на што прышлося-б затраціць ня больш 2 дзён. Сіроцінская ячэйка комсамолу стаяла ў баку ад сваячасовай падрыхтоўкі ільнапункту. У раёне будуецца адзін з буйнейшых ільназаводаў БССР. Сваячасова пусціць завод у ход—задача вялікага палітычнага значэньня. На будаўніцтве заводу няма яшчэ партыйнай ячэйкі. Здавалася-б, што комсамольская ячэйка будаўніцтва павінна зьявіцца ініцыятарам у хутчэйшым пуску заводу. Аднак, тут бачым зусім адваротнае. Комсамольцы у большасьці не ахоплены соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам, некаторыя комсамольцы робяць прагулы.

Ня гледзячы на тое, што „левыя“ загібы, якія мелі ў партыйнакамсамольскім кіраўніцтве, зараз у асноўным выпраўлены. Лоўдаскі с-савет абклаў цьвёрдым заданьнем нявялікіх беднякоў і серадьнякоў. Побач з наяўнасьцю фактаў „левых“ загібаў, Мішнявіцкі с-савет праводзіў правую практыку ў загатоўках: сапраўдныя заможнікі, якія плоцяць па 100 р. і зыш падаткаў, не абкладзены цьвёрдым заданьнем.

Комсамольскія ячэйкі ня прымаюць удзелу ў спагнаньні цьвёрдых заданьняў з кулацка-заможных гаспадарак.

Ня дзіва, што на 20-е кастрычніка цьвёрдыя заданьні хлеба былі спагнаны на 4 проц., бульбы—на 39 проц. і льнасемя на 3%.

Комсамольская арганізацыя ня гледзячы на рад пасьпехаў у арганізацыі колгасаў раёну, у выключнай большасьці апынулася ў глыбокім тыле арганізацыйна-гаспадарчага замацаваньня колгасаў.

Раён налічвае 232 колгасы, з якіх большасьць не перайшла на зьдзельшчыну, не ліквідавала абязьлічку і г. д.

Сакратар 1-й цэхавай ячэйкі комуны Сталіна, на пытаньне якія захады прыняла ячэйка для ўмацаваньня комуны, адказаў: „Амаль усе нашы комсамольцы займаюць камандныя вышыні ў с-савеце, а таму няма часу займацца гэтым пытаньнем. Што гэта за камандныя вышыні? Аказваецца комсамольцы працуюць у якасьці справаводаў у с-савеце, сельпо, колгасе і г. д.

Комсамольцаў на непасрэдны вытворчай працы ў колгасе вельмі мала. Укомплектаваньнем колгасніга гурту ра ьмеркаваньнем ураджаю ячэйкі комуны Сталіна не займаліся.

Ячэйка Сталіна не адзінокая ў гэтым напрамку. Іх большасьць у раёне.

Машынна-трактарная станцыя р-ну мае ў сваёй рабоце рад буйнейшых прарываў: у вяблівым ворыве у апрацоўцы льну і г. д. Комсамольская ячэйка станцыі ня цікавілася работай МТС. З 16 комсамольцаў ячэйкі толькі 6 працуюць непасрэдна ў МТС, рэшта—у розных установах раёну. Комсамольцы не зьяўляюцца ініцыятарамі соцспаборніцтва і ўдарніцтва, не зьлікваідавалі абязьлічку, не змагаюцца з прастоямі трактароў. Пытаньнем падрыхтоўкі кадраў для станцыі, у якой мяцца вострая патрэба, комсамольская арганізацыя начале з райкомам комсамолу не займалася.

Бясчынна выконваюцца рашэньні 9-га зьезду УсеЛКСМ аб стварэньні прыкожным колгасе комсамольскай ячэйкі. Толькі ў 28 колгас х з 232 маюцца комсамольскія ячэйкі. Рай ком комсамолу ў сваіх рашэньнях няправільна арыентаваў арганізацыю ў пытаньнях стварэньня комсамольскіх ячэек у колгасах. У пастанове пленуму РК запісана, што кожная ячэйка павінна арганізаваць не менш 2 комсамольскіх ячэек.

У шмат якіх колгасах па 4-5 комсамольцаў, але там не арганізаваны комсамольскія ячэйкі.

Ня глядзячы на мізэрны рост організацыі (прыняты ў комсамол за 1931 г. каля 200 чал.), замацаваньне навічкоў пастаўлена з рук вон дрэнна.

Безумоўна, што ў прарывах арганізацыі віноўна і абсалютная большасьць партыйных ячэек. Так, у ячэйках „Бальшавік“, „Чырвоны пагранічнік“, МТС, Вобальскай асоутнічалі парт прымацаваньні. Ёсьць факты, калі на году і больш не заслухоўваліся справаздачы комсамольскіх ячэек.

Мішнявецкая ячэйка КП(б)Б прыняла зусім няпр вільную пастанову ў пытаньнях росту комсамольскага колектыву. Ячэйка запісала: „прапанаваць комсамольскаму колектыву ў бліжэйшы час уцягнуць 100 проц. бядняцка серадняцкай моладзі ў комсамол“. Гэтая ўстаноўка супярэчыць у карані рашэньням комсамольскіх зьездаў.

Райком комсамолу не перабудаваў сваю работу адпаведна з новымі задачамі. Вышэй паданыя факты гавораць аб тым. што РК ЛКСМБ ня здолеў кіраваць арганізацыяй і павінен быць абноўлены.

Чарняўскі

Конкрэтныя справы вушацкіх комсамольцаў

Комсамольская арганізацыя Вушацкага раёну дабілася посьпехаў пры дапамозе партыйнай арганізацыі на усіх вучастках гаспадарча будаўніцтва. За зімовы час сілаю комсамолу былі арганізаваны 21 колгас з лікам гаспадарак 600, на плошчы 4000 га. Акрамя гэтага у старыя колгасы уцягнута 277 гаспадарак. Праведзена 88 адзіадзеных паходаў на дапамогу колгасам у падрыхтоўцы да веснавых сяўбы. У гэтых паходах прынялі ўдзел каля 300 комсамольцаў і 10 тыс. беспартыйнай працоўнай моладзі.

Сіламі комсамольцаў было праведзена 265 сходаў па пытаньнях веснавай пасеўнай кампаніі 1931 г. арганізавана 21 ініцыятыўных і варбовачных груп па арганізацыі колгасаў, ачышчана веснавых каля 4000 пуд. арганізавана 36 брыгад з комсамольцаў і моладзі.

Праведзена больш 200 суботнікаў на уборцы ураджаю, асабліва тэхкультур.

Па пытаньню асеньняй сяўбы, сіласаваньня, уборкі комсамольскай арганізацыяй праведзена звыш 300 сходаў.

Да скончаньня асеньняга севу (15-га верасьня) раён быў колекты вісаваны на 60 проц. Дырэктыва партыі выканана на тры м-цы раней тэрміну.

Барацьба комсамольскай організацыі была накіравана на організацыйнае замацаваньне колгасаў. Комсамольская ячэйкі („Чырвоны Кастрычнік“, „Адважны барацьбіт“, „Чырвоная Полаччына“, „Комунар“ і інш.) прынялі актыўны ўдзел у пераводзе колгасаў на зьдзельшчыну, у разьмеркаваньні ўраджаю і г. д.

Організацыя дабілася бальшавіцкіх перамог у барацьбе за шматлікі ды комсамол: да 9-га зьезду УсеЛКСМ організацыя налічвала 300 чалавек, а ўжо да 17-га МЮДу—1025. Да 14 гадавіны Кастрычніка організацыя налічвала у сваіх радох 1300 комсамольцаў, за час 9-га зьезду вырасла на 400 проц.

Лёзунг „комсамольская ячэйка—у кожным колгасе“ знашоў сваё практычнае ажыцьцяўленьне ў організацыі. Калі на 15-е студзеня было 16 комсамольскіх ячэек, у ліпені 30, дык к 17 МЮДу мелі ужо 60 ячэек, а зараз мы маем 80 ячэек пры колгасах.

Рост не адарваны ад замацаваньня. Працуюць 70 гуртkoў па ліквідацыі палітнепісьменнасьці навічкоў, а таксама і старых комсамольцаў.

Аўладаньне марксысцка-ленінскай тэорыяй непарыўна зьвязана з выкананьнем чарговых гаспадарча-палітычных задач на вёсцы.

Аднак, у выкананьні пляну загатовак організацыя нейкі час стаяла у баку. Зараз усе комсамольцы мобілізаваны на гэты адказьнейшы фронт.

Гінзбург.

Першы этап скончан

Не здаваць заваяваных тэмпаў

Раўняцца па комсамолі Віцебску ў бальшавіцкай барацьбе за фінплян

Выкананьне фінансавага пляну—адна з важнейшых умоў для пасьпяховага выкананьня пляну 3-га рашаючага.

Значныя посьпехі, дасягнутыя ў зьвязку з правядзеньнем першага маршруту фінэстафэты, павінны быць зараз ня толькі замацаваны, але і значна паглыблены.

На вопыту перадавых у барацьбе за фінплян комсамольскіх організацый трэба організоўваць масавую работу па далейшае правядзеньне фінэстафэты і поўнае выкананьне фінпляну па ўсіх раёнах.

Комсамолія штурмуе прарыў

Віцебская комсамольская організацыя, уключыўшыся ў фінэстафэту, паставіла сваёй задачай уцягнуць усіх комсамольцаў у ашчадкасы. Кожны комсамолец атрымаў заданьне ўцягнуць ня менш 2 укладчыкаў. Па ўсіх ячэйках створаны брыгады для праверкі запавычаласьці па паявых узносах укладах у кооперацыю.

Гаркамол накіраваў у вёску брыгаду з 5 комсамольцаў для дапамогі правядзеньню фінэстафэты і ліквідацыі прарыву ў выкананьні фінпляну.

З. В—ок

Дэпутаты гарсавету змагаюцца за выкананьне фінпляну

Шырока разгарнулася фінэстафэта на Віцебскай швэйнай фабрыцы „Профінтэрн“, якая скончыла 5 годку ў 3 гады.

Усе рабочыя ахоплены падпіскай на пазыку 3-га рашаючага. Зараз праводзіцца ахоп падпіскаю новых рабочых.

У кожным цэху вылучан актыў фінармейцаў. Задача актыву—вярбаваць новых укладчыкаў у ашчадкасы, дапамагаць ЗРК ва ўзмацненьні тэмпаў паянакапленьня. Фабрыка паслала ў падшэфныя сельсаветы брыгады для дапамогі правядзеньні фінэстафэты.

Вялікую работу праводзіць на фабрыцы дэпутацкая група гарсавету, якая ўзяла на сябе рад конкрэтных абавязацельстваў.

Рабочы колектыў фабрыкі узяў на буксір „Сьцяг індустрыялізацыі“, які адстае ў выкананьні фінпляну.

Юнкорпост „Ч. З.“ Д. Усыскін. З. Ваўчок.

Колектыўна застрахаваліся

Комсамольцы бэтоннага заводу сувязі (Менск), уключыўшыся ў фінэстафэту, абавязаліся стаць укладчыкамі ашчадкасы, вылучылі спэцыяльнага ашчадпрацаўніка. Уся ячэйка колектыўна застрахавалася. Ліквідуецца запазычанасьць кооперацыйным і грамадзкім організацыям.

На заводзе працуе спэцыяльная брыгада, вылучаная комсамольскай ячэйкай для правядзеньня масавых мерапрыемстваў па рэалізацыі п тых абавязкаў.

Юнкорпост Лібэнсон, Мазалеўская, Ігнатовіч, Кутузаў, Крывашэеў.

Вынікі масавай работы

Увесь актыў Людзяліпіцкага сельсавету Жыткавіцкага раёну мобілізаваны на правядзеньне фінэстафэты. У выніку масавай работы сярод колгасьнікаў і аднаасобнікаў толькі за адну пяцідзёнку сабрана па ўсякіх узносах 7925 руб. 41 к.

П. Васілеўскі, Гельфанд.

Заданьне перавыканана

Рапарт Гомельскаму гаркому ЛКСМБ, рэдакцыям газэт «Чырвоная Зьмена“ і „Палеская Праўда“

Заданьне Гаркамолу ўкласьці ў ашчадкасу за 4-ы квартал 1000 р. колектыў ЛКСМБ фабрыкі „Праца“ датэрмінова выканаў з перавышэньнем на 180 руб.

Комсамольцы фабрыкі перадаюць гэтыя сродкі ў фонд укладаў імя 14-й гадавіны Кастрычнікавай рэволюцыі і абавязваюцца штомесячна ўносіць уклады з тым разьлікам, каб ашчадкаса стала сапраўдным касірам кожнага комсамольца.

Сакратар колектыву ЛКСМ Фрэнклах.

Рыхтуемся да конфэрэнцыі МенАПП

Менская комсамолія распрацоўвае пытаньні пролетарскай літаратуры

Гэтымі днямі Менгарком ЛКСМБ абгаварыў пытаньні, зьвязаныя з падрыхтоўкай і правядзеньнем конфэрэнцыі МенАПП. Усе вытворчыя колектывы ЛКСМБ заслухоўваюць на сваіх сходах даклады аб становішчы пролетлітаратуры БССР і аб барацьбе за комсамольскую тэматыку, наладжваюць праверку выкананьня дагавору, заключанага паміж комсамоліяй і МенАППам.

11-га лістапада адбыліся першыя сходы колектываў ЛКСМБ з дакладамі пра пролетарскую літаратуру. На заводзе імя Варашылава з дакладам выступіў генэральны сакратар БелАПП т. Платон Галавач. Ахарактарызаваўшы становішча пролетарскага літаратурнага руху ў БССР, т. Галавач падрабязна спыніўся на пытаньні заклікy ўдарнікаў у літаратуру. Завод імя Варашылава на сё ьняшні дзень мае адзін з мацнейшых у горадзе літаратурны гурток БелАППу.

На сходзе колектыву цалкам акомсамоленай МШВ чыгункі з дакладам выступіў т. Барыс Мікуліч. Таварышы, выступаўшыя ў спрэчках, адзначалі слабую работу літаратурнага гуртка. Кіраўнікі літгуртка, вылучаныя МенАПП, нядбайна адносяцца да сваіх абавязкаў.

У друкарні імя Сталіна дакладчык т. Сьцяпан Ліхадзіеўскі. На сходзе комсамольцамі было пададзена шэраг заяў аб уступленьні ў літгурток.

Колектыў ЛКСМБ друкарні ўзяў шэфства над друкаваньнем зборніку творчасьці рабочых ударнікаў, які павінен выйсьці да конфэрэнцыі. Колектыў уключаецца ў работу па напісаньню гісторыі друкарні.

Сходы адбываліся і на іншых прадпрыемствах. Аднак, некаторыя бюро колектываў халатна адносяцца да гэтай справы, ня выконваюць пастановы ГК ЛКСМБ і адцягваюць скліканьне сходаў. (Фабрыка Крупскай „8-га сакавіка“, „Полымя рэволюцыі“ Беньямінсаюз і інш.).

Гарком ЛКСМБ на такіх адносінах павінен рашуча ўдарыць і сваячасова папярэдзіць зрыў сходаў.

Бас.

Пэдкадры—усеабучу

Выканаць шэфскія абавязкі

Віцебск. Комсамольская організацыя Віцебску недаацаніла вялізарнай важнасьці задачы мобілізацыі комсамольцаў у пэдагогічныя навучальныя ўстановы. Аб гэтым красамоўна сьведчыць праведзены юнкорамі „Чырвонай Зьмены“ рэйд па буйнейшых колектывах ЛКСМБ г. Віцебску.

Фабрыка імя К. Цэткін

Пытаньнем мобілізацыі комсамольцаў у пэдустановы комсамольскі колектыў не займаўся, ня гледзячы на катэгорычныя пастановы ЦК ЛКСМБ. На фабрыцы маюцца 700 комсамольцаў, але вылучэньне у пэдустановы ідзе самацёкам. Так у яўрэйскі пэдтэхнікум вылучана 4 чал., у індустрыяльны 2 і г. д.

Прадзільная фабрыка

Тут справа абстаіць ня лепш. Пытаньне аб мобілізацыі ў пэдустановы стаяла на колектыве, але да гэтага часу вылучаны толькі 2 комсамольцы. Як комсамольцы навучаюцца колектыў не правярае. Ёсьць выпадкі, калі комсамольцы бяз ведама колектываў „пералётваюць“ з адной установы ў другую.

Завод „Комінтэрн“

На запытаньне—„як у вас ідзе вылучэньне комсамольцаў у пэдустановы“ сакратар адказвае: „нічога ня ведаю, прыходзьце ў другі раз“.

У гутарцы з комсамольцамі мы даведаліся, што колектыў гэтай справай не займаўся.

*

Мобілізацыя комсамольцаў у пэдустановы па г. Віцебску у большасьці выпадкаў сарвана. Становішча пагражаючае. У пэдрабфак навучаюцца 450 комсамольцаў замест вызначаных 500. Ня лепшае становішча і ў іншых пэдагогічных навучальных установах.

Пэдагогічныя навучальныя установы чакаюць папаўненьня за лік лепшых ударнікаў-комсамольцаў. Віцебскі гарком ЛКСМБ павінен неадкладна разгледзець пытаньне аб выкананьні пастановы ЦК ЛКСМБ аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў у пэдагогічныя навучальныя установы. Трэба ўжыць рашучыя захады для выкананьня сваіх шэфскіх абавязкаў над усеабучам.

Юнкоры ударнікі „Ч. З.“ Усыскін Д., Ваўчок З., Усыскін М., Багданаў Г., Шмідт У., Капыскін З.

Маладзёжныя сельгасстанцыі — опэрацыйныя штабы комсамолу

Забясьпечыць станцыі сродкамі вытворчасьці і кадрамі спэцыялістых

Організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў на даным этапе колгаснага будаўніцтва зьяўляецца цэнтральнай задачай партыі, комсамолу і ўсей савецкай грамадзкасьці ў барацьбе за соцрэконструкцыю сельскай гаспадаркі. Цэнтральная сельска-гаспадарчая станцыя моладзі і раённыя сельска-гаспадарчыя станцыі, якія організоўваюцца пры РК ЛКСМБ, забавязаны адыграць у вырашэньні гэтай задачы вялікую ролю.

Сельска-гаспадарчая станцыя моладзі зьяўляецца організацыйна-дасьледчай базай комсамолу і моладзі. Яна павінна дапамагчы партыі і комсамолу мобілізаваць шырокія масы моладзі і колгаснай моладзі на хутчэйшае выкананьне пляну соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, на барацьбу за спэцыялізацыю і высокую таварнасьць соцыялістычнай вытворчасьці, за масавае ўкараненьне досьледаў агронавукі ў соцыялістычную сельскую гаспадарку.

Станцыі моладзі павінны быць застрэльшчыкамі і організатарамі комсамольскай моладзі ў барацьбе за правільнае зьдзельшчыны ў колгасах, наладжваньне плянавасьці колгаснай і саўгаснай вытворчасьці, уліку разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў колгасах на аснове колькасьці і якасьці працы, быць ініцыятарам шырокага ўжываньня саўгасамі колгасамі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, шырокага разгортваньня вопытна—дасьледчай работы з тым, каб дасягненьні навукі перанесьці з лябораторыяў у сёльска-гаспадарчую вытворчасьць.

У некаторых раёнах—Быхаўскім, Віцебскім, Горацкім, Клімавіцкім, Пухавіцкім, Смалявіцкім—раённыя сельска-гаспадарчыя станцыі моладзі організаваліся яшчэ ў пачатку 1931 году. Гэтыя станцыі правілі значную дасьледчую вытворчую работу, організавалі па колгасах і саўгасах дзесяткі брыгад вопытнікаў і вынаходцаў.

Горацкая і Быхаўская сельска-гаспадарчыя станцыі праз стварэньне курсаў і гурткоў па падрыхтоўцы кадраў правялі вялікую работу ў галіне падрыхтоўкі кадраў з моладзі для колгаснай вытворчасьці.

Цэнтральная станцыя ЦК ЛКСМБ зараз працуе над тым, каб да першага сьнежня 1931 году ва ўсіх раёнах БССР (пры раённых камітэтах комсамолу) організаваць маладзёжныя станцыі. Гэту работу прыходзіцца праводзіць у надзвычайна цяжкіх умовах. Маладзёжныя сельска-гаспадарчыя станцыі ў радзе раёнаў недаацэньваюцца зямельнымі і колгаснымі організацыямі. Станцыі ня маюць патрэбных сродкаў вытворчасьці, кадраў спэцыялістых, памяшканьня для работы, сродкаў на навукова-масавую работу.

Маладзёжныя станцыі павінны быць опэрацыйнымі штабамі комсамолу ў яго барацьбе за высокую ўраджайнасьць соцыялістычных палёў, за жывёлагадоўлю, за наладжваньне вопытна-дасьледчае працы і ўкараненьне соцыялістычных мэтодаў і форм працы ў саўгасах і колгасах.

Гэту задачу маладзёжныя станцыі змогуць выканаць толькі пры тэй умове, калі будуць мець добрыя ўмовы для працы. Станцыі зьявяцца сапраўднымі організатарамі шырокіх мас комсамольцаў і моладзі на вырашэньне гэтых задач, калі яны будуць забясьпечаны адпаведнымі кадрамі спэцыялістых і організатараў.

Уся ўвага комсамольскай організацыі раёна, колгассаюзаў і ўсёй грамадзкасьці павінна быць накіравана на тое, каб умацаваць работу станцыі і забясьпечыць іх кадрамі кваліфікаваных работнікаў, грашыма, сродкамі вытворчасьці і памяшканьнямі для вопытна-дасьледчай працы.

Комсамольскія ячэйкі саўгасаў і колгасаў абавязаны дапамагчы раённым станцыям моладзі ў стварэньні ва ўсіх колгасах і саўгасах брыгад вопытнікаў і вынаходцаў і ў разгортваньні дасьледчай работы з імі.

Зрушуем усю ўвагу на ўмацаваньне работы опэрацыйных штабаў комсамолу ў барацьбе за высокую таварнасьць соцыялістычнай гаспадаркі.

Т. Броўкін.

На парадак дня — якасьць тэорэтычна-вытворчага і грамадзка-палітычнага выхаваньня

ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ ПАВІННЫ ПАЛЕПШЫЦЬ КІРАЎНІЦТВА ШКОЛАМІ ФЗВ, ЗМАГАЦЦА ЗА ДАЛЕЙШАЕ ЗАМАЦАВАНЬНЕ ЗАВАЯВАНЫХ ПОЗЫЦЫЙ



На 16 лістапада г. г. склікаецца першая гарадзкая конфэрэнцыя школ ФЗВ г. Менску.

Конфэрэнцыя павінна абмеркаваць вострыя пытаньні, зьвязаныя з далейшым палепшаньнем тэорэтычна-вытворчага і грамадзка-палітычнага выхаваньня ў школах ФЗВ.

Зьмешчаны сёньня матар'ял з МШВ і хлебазаводу яскрава гаворыць аб тым, што на гэтым вучастку працы, у гэтым асноўным зьвяне падрыхтоўкі для ўсіх галін прамысловасьці кваліфікаваных кадраў ня ўсё ў парадку.

Праўда, папярэдняя падрыхтоўка да конфэрэнцыі і абвешчаны конкурс на лепшую школу ФЗВ далі некаторае палепшаньне ў тэорэтычна-вытворчым навучаньні і грамадзка-палітычным выхаваньні ў школах ФЗВ.

Дні да конфэрэнцыі комсамольскія організацыі павінны скарыстаць на яшчэ большае палепшаньне працы школ ФЗВ, каб прыйсьці на конфэрэнцыю з рапартам перамог.

„Вучань!-аддавай струмант“

Менская школа чыгуначнага вучнёўства (МШВ) перавала на практыку ў дэпо 62 вучняў сьлесараў-паравозьнікаў.

Для праходжаньня практыкі гэтай групаю фабзавучнікаў, адміністрацыя дэпо паклапацілася адвесьці памяшканьне, у якім раней меркавалася праводзіць рамонт. Усё паравое ацяпленьне зьнята. Домкраты для пад'ёму паравозаў сапсаваны, што было своечасова заўважана тэхнікам дэпо.

Усё-ткі ў гэтым памяшканьні фабзавучнікі распачалі рамонт паравоза сэрыі Щ—455.

Адносіны адміністрацыі дэпо да вучняў МШВ надзвычай дрэнныя, чым фактычна зрываецца праходжаньне вытворчай практыкі.

— Вы працуеце ня зьдзельна, дык аддайце нам струмант,—так нярэдка заяўляюць фабзавучнікам рабочыя.

— Ат, гэта ня наш паравоз— вучнёўскі. Ідзеце на наш працаваць, а тут яшчэ пасьпееце—кажа майстар дэпо кацельшчыкам.

І вось ужо другі месяц няма—скатаў. Вучні цэлымі днямі нічога не робяць, і ніхто на гэта не зьвяртае ўвагі.

Мы патрабуем тэрмінова высьветліць, чаму не прысылаюцца скаты і прыцягнуць да адказнасьці вінаватых у зрыве вытворчай практыкі вучняў МШВ.

А. Давідовіч.

Палепшыць вытворчае навучаньне

У пэрыод тэхнічнай рэконструкцыі транспорту асабліва востра паўстала пытаньне аб тым, каб палепшыць якасьць і прысьпешыць падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў праз сетку школ ФЗВ.

Аднак, мясцовыя кіраўнікі і організацыі чыгункі не ўразумелі гэтую задачу, высунутую навейшымі запатрабаваньнямі транспарту. Справа ідзе аб начальніку дэпо, які сваёй бязьдзейнасьцю ў праходжаньні вытворчага навучаньня (зрыве практыкі) вучняў МШВ.

Вучні групы „Д“ і „В“ паравозьнікаў павінны былі з 5-га верасьня праходзіць у дэпо вытворчую практыку—замацаваць тэорэтычныя веды, набытыя на працягу навучальнага году. З першых дзён практыкі вучні сталі перад сьцяной біюрократызму. Начальнік дэпо т. Якаўлеў абмежаваўся толькі тым, што вызначыў састаўленую адзінку—паравоз Щ 455 для вытворчага навучаньня вучняў МШВ. Рамонт паравоза ідзе чарапашымі тэмпамі, ня гледзячы на тое, што мінуў ужо 2 месяцы, як [за яго ўзяліся.

Ня зусім добра і з кіраўніцтвам практыкай. Да гэтай працы ня прыцягнуты спэцыялісты.

У выніку такой бязьдзейнасьці вучні зараз засталіся без працы. Вытворчае навучаньне зрываецца. Вытворчае навучаньне ў праграже падрыхтоўкі добраякасных кадраў для соцыялістычнага транспарту.

Комсамольская організацыя чыгункі да агульна-гарадзкой конфэрэнцыі павінна зьнішчыць тормазы ў вытворчым навучаньні, дабіцца якаснага палепшаньня тэорэтычна-вытворчага і грамадзка-палітычнага выхаваньня ў МШВ.

Вучань гр. „Д“ С. Ж-о.

Комсамольская ячэйка слаба кіруе працай ФЗВ

У ФЗВ хлебазаводу займаецца 150 вучняў, якія разьбіты на 11 брыгад па тэорэтычна-вытворчаму навучаньню.

ФЗВ у галіне грамадзка-палітычнага выхаваньня зрабіла ня мала. Працуюць 3 сэктары: соцыяльна-бытавы, вытворча-масавы і культурны. Організаваны тэхнічны і вайсковы гурткі, наладжваецца праца грамадзкіх організацый: МОПР'у, Асоавіяхему. Праз 2 дні выходзіць насьценгазета „Ільічоўча“.

Уся праца школы ФЗВ накіравана на выкананьне 6-ці ўмоў т. Сталіна. У школе ліквідавана ўраўнілаўка і абязьлічка. Да кожнай брыгады прымацаваны інструманты і варштаты, за якія кожны брыгадзір і брыгада цалкам адказваюць. Праз кожныя 6 месяцаў адбываецца экспэртная камісія, якая прагледзе разрады і павышае іх у залежнасьці ад набытай вучнямі кваліфікацыі.

Дасягненьні ў працы школы ФЗВ усё-ж невыстарчальны. Комсамольская ячэйка вельмі слаба кіруе працай школы. Аб гэтым можа сьведчыць 77 проц. ахоп вучняў комсамолам.

Лівін Г.

Тэрмінова стварыць у кожным колгасе ўдарныя брыгады для пераапрацоўкі лёну

За час месячніку дабіцца максімальнага выкананьня пляну першапачатковай апрацоўкі і здачы дзяржаве ільнавалакна

Вушацкі раён ўключыўся ў абвешчаны ЦК КП(б)Б месячнік

УКЛЮЧЫЛІСЯ

ВУШАЧЫ. (Ад нашага спэцкора) Вушацкі раён уключыўся ў абвешчаны ЦК КП(б)Б з 10-га лістапада да 10-е сьнежня месячнік першапачатковай апрацоўкі і загатовак ільнавалакна. Раённы камітэт партыі высунуў сустрэчны плян загатовак трасты, вызначыўшы тэрмін загатоўкі на 20-га лістапада. Устаноўлена колькасьць ільнатрасты, якую трэба здаць заводам.

Партыйным ячэйкам і с-саветам дадзена суровае ўказаньне поўнасьцю абкласьці да 20-га лістапада кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдымі заданьнямі, выканаць поўнасьцю плян загатовак ільнанасеньня і к 10-му сьнежня ня менш як на 70 проц. выканаць плян загатовак ільнавалакна.

Каб пасьпяхова правесьці абвешчаны ЦК КПбБ месячнік, раённы камітэт партыі і РВК мобілізавалі ўсю грамадзкасьць раёну. У колгасах разгорнута ўдарная работа. Шэраг колгасаў ужо дасягнуў вялікіх посьпехаў. У 6-ці колгасах лён зьняты са сьцілкі і пачата яго апрацоўка. Гэтыя колгасы падрыхтавалі сушылкі і дровы для сушкі. Большасьць колгасаў, каб паскорыць тэмпы пераапрацоўкі склалі ўдарныя брыгады па апрацоўцы лёну, шырока разгарнулі соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Колгас „Комунар“ Гарбацікага с-савету „Самалёт“—Зарачанскага с-савету, „Чырвоны Кастрычнік“ В.-Сарачынскага с-савету, „Новы шлях“ Сарачынскага с-савету і інш. па-ўдарнаму пераапрацоўваюць лён.

Ёсьць, аднак колгасы, якія вялікую колькасьць лёну ня зьнялі са сьцелішча, не падрыхтавалі сушыльні, дроў, ільнамялак, не організавалі брыгад для мяцьця і трапаньня лёну. Да гэткіх колгасаў адносяцца: „Чырвоны араты“, „Першамайск“, „Чырвоная Зьмена“ „Прымежнік“, „Чырвоны комунар“.

Аднаасобны сэктар не пачынаў першапачатковай апрацоўкі і загатоўкі лёну.

Комсамольская організацыя слаба ўдзельнічае ў гэтай кампаніі.

Комсамольская організацыя абавязана па-баявому ўключыцца на выкананьне конкрэтных задач, вызначаных райкомам партыі для правядзеньня месячніка.

Ударна за работу! Мобілізаваць усе сілы і энэргію на пасьпяховае правядзеньне месячніку, выканаць у найкарацейшы тэрмін плян ільназагатовак.

Комсамол—у першыя рады барацьбітоў

Старобін. Апрацоўка і здача лёну па раёне праходзіць вельмі дрэнна. Загатоўчыя організацыі праявілі ў загатоўках опортуністычную бязьдзейнасьць і стаўку на самацёк. Па раёне загатоўлены толькі некалькі кілё ільнавалакна. Колгас „Чырвоны хлебароб“ яшчэ не абмалаціў лён з 16 гэктараў. Комсамол не пераключыўся на выкананьне дырэктывы ЦК КП(б)Б аб пераапрацоўцы лёну.

Тэкстыльная прамысловасьць чакае ільнасыравіну. Трэба зараз-жа ўзмацніць работу па першапачатковай апрацоўцы і здачы лёну дзяржаве. Комсамол—у першыя рады барацьбітоў за лён!

Б. Палескі

У найкарацейшы тэрмін здаць лён дзяржаве

Праўленьне колгасу „Новая жыцьцё“ Сімонаўскага с-савету (Талачынскі раён) не зьвярнула належнай увагі на апрацоўку. Узьняты са сьцілкі лён больш 2-х месяцаў ляжыць на полі, а значная частка ляжыць яшчэ разасланай. Колгас ня здаў дзяржаве ні аднаго кілёграма лёну.

Выцерабленыя канаплі стаяць на полі каля м-цу. Абмалот канапель не распачаты.

Праўленьне колгасу ня склала рабочага пляну апрацоўкі лёну і канапель, ня склала брыгад. Соцспаборніцтва і ўдарніцтва на разгорнута, зьдзельшчына праведзена формальна. Няма норм выпрацоўкі і ўліку працы.

Што робіць комсамольская ячэйка? Нічога. Комсамольцы палец аб палец ня выцялі, каб паскорыць апрацоўку і здачу дзяржаве ільнавалакна.

Трэба пакончыць с бязьдзейнасьцю і дабіцца, каб уся праца па апрацоўцы лёну і канапель была тэрмінова пераведзена на зьдзельшчыну, разгарнуць соцспаборніцтва і ўдарніцтва, скласьці маладзёжныя ўдарныя брыгады.

М.

Скласьці ўдарныя брыгады з комсамольцаў

ПОЛАЧЧЫНА. Кушлікоўскі с-савет зьяўляецца ільнаводным. Здавалася-б што с-савет павінен усю ўвагу зьвярнуць на своечасовую і добраякасную першапачатковую апрацоўку і здачу таварнай продукцыі лёну дзяржаве. Між тым с-савет ня цікавіцца пераапрацоўкай лёну. У большасьці колгасаў лён яшчэ не абмалочан. У колгасе імя Дзяржынскага да 2-га лістапада застаўся неабмалочаным лён з 42 гэктараў. Лён ляжыць у кучах пад адкрытым небам. С-савет ня зьвяртае на гэта ўвагі.

Праўленьні колгасаў ня прымаюць ніякіх мер, каб лепш організаваць працу, укараніць зьдзельшчыну і абмалаціць лён.

Таксама комсамольскія ячэйкі ня штурхаюць праўленцаў на хутчэйшае скончэньне абмалоту і пераапрацоўкі лёну. З-за гэтага па с-савеце зрываецца ільназагатоўчая кампанія. Толькі адзін колгас „Старапольле“ здаў некалькі цэнтнэраў ільнатрасты.

Райком комсамолу абязан дапамагчы колгасу Дзяржынскага разгарнуць пераапрацоўку лёну, райком павінен скласьці для гэтага комсамольскія ўдарныя брыгады.

М. Віленскі.

30 актывістых на загатоўкі

Клімавічы. (Па тэлеграфу). Для ліквідацыі прарываў ва ўсіх відах нарыхтовак Райком комсамолу мобілізаваў 30 чалавек раённага комсамольскага актыву. Комсамольскія ячэйкі пры дапамозе раённага актыву організавалі у дні сьвят чырвоныя абозы збожжа.

Райкамол.

Множыць прыклад

ЦераХаў. Сіламі комсамольскай ячэйкі Вуцеўскага с-савету організаваны чырвоны абоз з 1000 пудоў бульбы і 1000 пуд. збожжа. Прыклад комсамольцаў Вуцеўскага с-савету трэба множыць.

Ратнэр.

У краінах аплеценых кратамі турмаў

Жудасныя зьдзекі баўгарскіх катаў, антысэміцкія пагромы ў Варшаве, масавыя арышты і забойствы—

НЯ СПЫНЯЦЬ МАГУТНАЙ ХВАЛІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫХ МАС У БАРАЦЬБЕ ЗА СУСЬВЕТНЫ КАСТРЫЧНІК

Баўгарская ахранка „актывізуе“ сваю „дзейнасьць“

ВЕНА 9. Баўгарская паліцыя апублікавала паведамленьне, у якім яна заяўляе, што ёю, нібыта, раскрыты цэнтральны камітэт комуністычнай партыі Баўгарыі. Арыштаваны члены ЦК баўгарскай компартыі за выключэньнем аднаго.

Пры арышце забіты Кафарджыеў, якога паліцыя называе членам ЦК. Акрамя таго, арыштаваны члены акруговага камітэту компартыі Софіі і Варны. У адной толькі Софіі арыштаваны звыш 120 асоб. Усіх арыштаваных паліцыя па-зьверску катуе. 5-га, не перанёсшы катаваньня, павесіўся Дракіеў, якога паліцыя называе казначэем ЦК. Спрабавалі наканчыць самагубствам, перарэзаўшы сабе вены шклом, Занеў і студэнт Няткоў.

Нават буржуазныя баўгарскія газэты паведамляюць аб жудасных катаваньнях арыштаваных. Студэнт Няткоў памёр. Пролетарскі пісьменьнік Хрысто Р. у безнадзейным стане пераведзены ў больніцу.

Баючыся масавых рэвалюцыйных выступленьняў рабочых, паліцыя забараніла грамадзкае пахаваньне Кафарджыева. Фракцыя рабоча-сялянскага блёку ўнесла ў парлямант протэст супроць забойства Кафарджыева і сыстэмы паліцэйскіх катаваньняў, патрабуючы неадкладна аслабаніць арыштаваных, перадаць суду забойцаў, адмяніць законы аб абароне дзяржавы.

6-га адбыліся шматлікія студэнцкія дэманстрацыі протэсту супроць забойства Няткова.

ЗАЎВАГА. Зьверскі забіты катамі баўгарскай буржуазіі Кафарджыеў зьяўляўся адным з актыўных працаўнікоў баўгарскай компартыі і комсамолу. У 1929 годзе баўгарскі суд завочна асудзіў Кафарджыева да 12 з паловай год зьняволеньня.

Падзеі ў Манчжурыі і дыплёматыя ПАЗШ

ВАШЫНГТОН. Сёньня раніцою Гувэр раіўся з Сімэнсам па пытаньню аб становішчы ў Манчжурыі. У міністэрстве замежных спраў ПАЗШ адмовіліся вызначыць адносіны ПАЗШ да дыплёматычнага байкоту і адкліканьня замежных прадстаўнікоў з Токіё, якое, згодна тэлеграмы з Жэневы, нібыта абгаварваецца ў колах Лігі нацый.

Чыноўнікі міністэрства замежных спраў ПАЗШ, як відаць зацікаўлены гэтай прапановай, але чакаюць ініцыятывы Лігі нацый.

Антысэміцкія пагромы — дымавая заслона ад крызісу

ВАРШАВА 11. Антысэміцкія выступленьні рэакцыйнага студэнцтва набываюць характар загадзя арганізаваных пагромаў. Гэтым шляхам арганізатары антысэміцкага руху імкнуцца адцягнуць увагу працоўных ад экономічнага крызісу, што з кожным днём усё болей абвастраецца і беспрацоўе, якое расьце нясупынна.

У час чарговай бойкі ля будынку ўнівэрсытэту забіты студэнт паляк Ваплаўскі. Гэты крок быў неадкладна скарыстан баёвікамі студэнтамі для пашырэньня эксцэсаў.

Бойка на тэрыторыі Віленскага ўнівэрсытэту, як паведамляе тэлеграфнае агенцтва, мае наступныя вынікі: адзін студэнт забіты, 4 лёгка паранена. Адзін паранены студэнт яўрэй, па апошніх зьвестках памёр. 15 студэнтаў лёгка паранена.

Консэрватыўны дэпутат лэдзі Астор „прозрела“

ЛЁНДАН 10. У спрэчках з прычыны прамовы дэпутата консэрватыўнай партыі герцогіня Этолл выступіла з антысавецкай прамовай, у якой паўтарала звычайныя байкі аб „савецкім дэмпінгу“ і „прымусовай працы“ у СССР. Між іншым, Этолл заявіла, што савецкі ўрад нібыта вэрбуе на работу дзяцей і пасылае іх у розныя раёны. Консэрватыўны дэпутат лэдзі Астор, якая нядаўна наведала СССР, заявіла, што ні ў адным прадпрыемстве Савецкага Саюзу яна ня бачыла дзяцей, і што савецкая ўлада прыкладае вялікія намаганьні для асьветы народу і ў прыватнасьці для навучаньня дзяцей.

Калі Этолл сьцьвярджала далей, што Англія павінна сачыць за ўмовамі працы ў Савецкім Саюзе, лэдзі Астор зноў перарвала яе, спытаўшы: „А што было пры царызьме?“.

Сарвана забастоўка партавікоў

БЭРЛІН. Гамбурскія партавікі прынялі рашэньне спыніць забастоўку. Кіраўніцтва рэформісцкіх профсаюзаў разам з фашыстымі і арміяй ратаваньня, прадпрыемцамі і штрэйкбрэхерамі фактычна сарвалі забастоўку.

Зрыву забастоўкі ня мала садзейнічаў і надзвычайны тэрор паліцыі.

Японскія войскі концэнтруюцца ў Манчжурыі


ШАНХАЙ. „Чайна прэс“ паведамляе, што з прычыны паслабленьня гарнізону Шэньяна ў выніку пераводу 11 тысяч войск у Таонань, Хондые (камандуючы японскай акупацыйнай арміяй ў Манчжурыі) зьвярнуўся ў Токіё з просьбай дадаткова прыслаць тры дывізіі войск з Японіі, а таксама ўсе вайсковыя часткі, якія могуць быць адпраўлены з Кореі.

Газэта сьцьвярджае, што ўздоўж чыгункі Таонань—Анганцы сконцэнтравана 16 тысяч японскіх войск.

Японскія самалёты над Цыцыкарам

БЭЙПІН. Японскія самалёты ў апошнія дні аднавілі свае палёты над Цыцыкарам, скідаючы бомбы, а таксама над кітайскімі часткамі войск генэрала Ма, якія разьмеркаваны каля гораду Цыцыкару на поўнач ад станцыі К-У чыгункі.

У капіталістычнай бацькаўшчыне замежнай дэлегацыі



Дэлегацыя саксонскіх комсамольцаў на заводзе і. Варашылава



Член дэлегацыі Эна Пэйпэльман гутарыць з работніцай заводу.

Дэлегацыя ў т. т. Чарвякова і Гіляковіча

Учора днём дэлегацыя саксонскай комсамоліі была прынята старшынёю ЦВК БССР тав. Чарвяковым і сакратаром т. Гіляковічам.

Гутарка працягвалася 4 гадзіны.

Тав. Чарвякоў гутарыў з дэлегацыяй аб мінулым Беларусі і сучасным разьвіцьці яе народнае гаспадаркі, аб нацыянальна-культурным будаўніцтве і, галоўным чынам, аб вырашэньні нацыянальнай проблемы ў БССР.

Тав. Гіляковіч азнаёміў дэлегацыю з нашай канстытуцыяй і сутнасьцю пролетарскай дэмократыі. Нашы госьці ставілі рад пытаньняў аднosна складаньня і выкананьня нашага пяцігадовага пляну. Дэлегаты падзяліліся з тав. Чарвяковым і Гіляковічам уражаньнямі аб БССР.

Тав. Гергард—член дрэздэнскага соцмолу—падрабязна расказаў аб тым, як яго соцыял-дэмократычныя ўяўленьні аб Савецкім саюзе пацярпелі крах пры азнаямленьні з барацьбой і перамогамі пролетарыяту Савецкай Беларусі. Ён заявіў, што вернецца ў Нямеччыну бальшавіком.

Дэлегаты расказалі таксама аб сваёй комсамольскай рабоце.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІС

Дом пісьменьніка 13-Х

А 7 гадзіне ўвечары адбудуцца заняткі Цэнтральнай рабочай літстудыі БелАПП'у.

Лекцыя проф. Замоціна па гісторыі расійскай літаратуры.

2. Аб Л. Н. Таўстым.

Запрашаюцца рабочыя літгурткоўцы, сябры яўрэйскай літстудыі, пісьменьнікі.

За яўку рабочых літгурткоўцаў адказваюць студыйцы, прымацаваныя да рабочых гурткоў. Падрабязна глядзі „Зьвязду“.

Бюро студыі.

Згодна пастановы сакратарыяту ЦК КП(б)Б, першага сьнежня склікаецца першая ўсебеларуская партыйная нарада па мастацтву.

Парадак дня

1) Задачы мастацтва ў рэканструкцыйны пэрыод;
2) Аб пляніраваньні мастацтва і падрыхтоўцы кадраў (даклад т. Гурскага);
3) Аб становішчы і далейшых задачах разьвіцьця тэатральнай справы ў БССР (даклад т. т. Вольскага і Кавакоціна);
4) Аб становішчы і далейшых задачах разьвіцьця музычнай оперной справы ў БССР (даклад т. т. Казакова, Любана і Гітгарца).
5) Аб выяўленчым мастацтве (даклад т. Гаўрыленка);
6) Шляхі разьвіцьця кінематаграфіі БССР (дакл. т. т. Рамановіча і Галкіна).
7) Трамы, самадзейнае мастацтва (дакл. т. т. Клімковіча і Шашура.

На нарадзе будуць працаваць сэкцыі па асобных галінах мастацтва пры ўдзеле партыйна-комсамольскага актыву працаўнікоў мастацтва.



Нашыя ворагі: самы верны лёкай нямецкай буржуазіі і самы ЛЮТЫ вораг рэвалюцыйнага руху—начальнік бэрлінскай паліцыі соцыял-дэмократ Гржэзінскі. Ад „добрага“ жыцьця палітзьняволены павесіўся на батарэі ў турэмнай камэры. Грабы рабочых, загінуўшых у шахтах Рура. Галоўны вагар „спакойства і парадку“—паліцыя—дзейнічае.

Рэвалюцыйныя дэманстрацыі працоўных Нямеччыны

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ ХІ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.